БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 94(476) «18/19»(043.3)+
+323.22/.28(476)(091) «18/19» – 053.81(043.3)

**Вярыга**
**Вадзім Аляксандравіч**

# МОЛАДЗЬ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (канец XIX ст. – жнівень 1914 г.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2019

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковы кіраўнік – **Коршук Уладзімір Канстанцінавіч,**
доктар гістрычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі
новага і навейшага часу
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Афіцыйныя апаненты: **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і
гісторыі мастацтваў
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

**Бусько Сяргей Іванавіч,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
фізічнай культуры».

Апаніруючая арганізацыя – **УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»**.

Абарона адбудзецца 28 лістапада 2019 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.

Паштовы адрас: пр-т Незалежнасці 4, Мінск, 220030.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09; e-mail: huzhalouski@gmail.com.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «17» кастрычніка 2019 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук прафесар А.А. Гужалоўскі

# УВОДЗІНЫ

Канец XIX ст. – жнівень 1914 г. – гэта час у гісторыі Беларусі, які вызначаўся шэрагам характарыстык, што якасна адрозніваюць яго ад іншых: актыўна праходзілі мадэрнізацыйныя працэсы, развіваліся капіталістычныя адносіны ў эканоміцы, фарміраваліся новыя сацыяльныя групы. Адбываліся змены ў грамадска-палітычным жыцці. Усё большую частку насельніцтва не задавальняла існуючае ў краіне самадзяржаўе, адсутнасць прававой роўнасці і іншыя феадальныя перажыткі, што ў сваю чаргу спрыяла рэвалюцыйнаму ўздыму ў краіне, фарміраванню палітычных партый і арганізацый, росту колькасці выступленняў, хваляванняў розных колаў грамадства. Сярод усіх катэгорый насельніцтва моладзь была той сацыяльнай групай, якая прымала актыўны ўдзел у адбываючыхся змяненнях, нярэдка з'яўляючыся іх ініцыятарам і галоўнай рухаючай сілай.

Нягледзячы на тое, што мінула стагоддзе, моладзь XXI ст., як і раней, актыўна ўдзельнічае ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь: стварае свае арганізацыі, выказвае сваю пазіцыю па тых ці іншых пытаннях у сродках масавай інфармацыі, далучаецца да партый, у некаторых выпадках прымае актыўны ўдзел у грамадска-палітычных мітынгах, шэсцях і інш. Улічваючы тую важную і адметную ролю, якую адыгрывала моладзь як у мінулым, так і ў XXI ст., даследаванне моладзі беларускіх губерняў з'яўляецца актуальным, бо дазваляе лепш разумець сучасную моладзь, яе цікавасці і патрэбы, спрыяе працэсу яе сацыялізацыі, будаўніцтву дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

На сённяшні дзень няма адзінага тлумачэння паняццю "моладзь", няма і адзіных дакладна вызначаных яе ўзроставых межаў. Дысертантам разглядаецца **моладзь** як унутрана дыферэнцыраваная сацыяльна-дэмаграфічная група, якая ўключае ў сябе людзей ад 16 да 28 гадоў, якія знаходзяцца ў працэсе станаўлення і развіцця сацыяльнай, псіха-фізіялагічнай, культурнай і грамадзянскай сталасці, маюць свае сацыяльныя статусы і ролі ў грамадстве, функцыі і віды дзейнасці, а таксама каштоўнасныя арыентацыі, інтарэсы, патрэбы і непасрэдна звязаны з характарам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага ладу, гістарычнай сітуацыяй.

Тэрытарыяльныя межы даследавання ахопліваюць межы сучаснай Рэспублікі Беларусь. Разам з тым у мэтах сістэмнага разгляду вывучаемага пытання ў дысертацыі таксама закранаюцца іншыя тэрыторыі, дзе беларусы складалі большасць ці значную частку насельніцтва. Такім чынам, геаграфічныя межы пашыраюцца пяццю беларускімі губернямі: Мінскай, Віцебскай, Магілеўскай, Гродзенскай, Віленскай. Акрамя таго, праводзіцца параўнальны аналіз у кантэксце тых працэсаў, што адбываліся ў суседніх губернях і ў межах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі.

Храналагічнымі межамі дысертацыі з’яўляецца канец XIX ст. – жнівень 1914 г. Ніжняя мяжа храналагічных рамак (1898 г.) тлумачыцца тым, што ў гэты час грамадска-палітычная актыўнасць моладзі значна ўзрасла ў параўнанні з папярэднім часам, што звязана з надыходам новага рэвалюцыйнага ўздыму ў краіне, паступовым стварэннем і актывізацыяй дзейнасці палітычных партый і арганізацый. З мэтай павелічэння кантролю за грамадска-палітычным жыццём краіны, у тым ліку на тэрыторыі беларускіх губерняў, узмацнення барацьбы супраць рэвалюцыйнага руху, у межах Дэпартамента паліцыі была праведзена рэарганізацыі і быў створаны Асобы аддзел, які першым з дзяржаўных органаў Расійскай імперыі вылучыў барацьбу з грамадска-палітычнай дзейнасцю моладзі ў якасці адной з галоўных задач сваёй працы. Разам з тым, у мэтах больш глыбокага даследавання праблемы ў дысертацыі закранаецца і больш ранні час. Верхняя мяжа (жнівень 1914 г.) непасрэдным чынам звязана з пачаткам Першай сусветнай вайны і кардынальным змяненнем грамадска-палітычнага становішча на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Да грамадска-палітычнай дзейнасці моладзі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стст. можна адносіцца па-рознаму, аднак вельмі важным з’яўляецца разуменне таго, што звяртаючыся да маладзёжнага пытання аднолькава небяспечны, як пазбяганне, так і празмернае выкарыстанне яго ў сваіх мэтах той ці іншай палітычнай сілай. Моладзь патрабавала і патрабуе пільнай, але ўзважанай увагі да сябе, і ні адна дзяржава, ні адно грамадства, ні адна палітычная ці грамадская сіла не павінны адмаўляць ёй у гэтым.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Даследаванне звязана з навукова-даследчымі працамі кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: «Эвалюцыя сацыяльнай актыўнасці насельніцтва Беларусі на этапе станаўлення індустрыяльнага грамадства (другая палова XIX – пачатак XX стст.)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20113061), якая выконвалася ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава», а таксама «Сацыяльныя змены ў грамадстве ва ўмовах капіталістычнай трансфармацыі эканомікі Беларусі (1861 – 1914)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20161683), якая выконваецца ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства», падпраграма «Гісторыя і культура».

### Мэта і задачы даследавання

*Мэта* дысертацыйнай работы: паказаць месца моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г.

У межах сфармуляванай мэты вызначаны наступныя *задачы:*

1) даць характарыстыку моладзі як сацыяльна-дэмаграфічнай групы;

2) паказаць ролю вучнёўскай моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў;

3) вызначыць накірункі дзейнасці сялянскай і рабочай моладзі ў грамадска-палітычным жыцці;

4) раскрыць напрамкі ўзаемаадносін моладзі і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый;

5) паказаць характар узаемаадносін моладзі з ліберальнымі і кансерватыўнымі партыямі.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца моладзь як сацыяльна-дэмаграфічная група на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст.

Прадмет даследавання – грамадска-палітычная дзейнасць моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна засноўваецца на тым, што дадзеная праца з’яўляецца першым спецыяльным навуковым даследаваннем, прысвечаным грамадска-палітычнай дзейнасці моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г. У дысертацыі ўпершыню прыводзяцца дадзеныя па колькасці моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у разглядаемы час, яе пола-ўзроставая дыферэнцыяцыя, узровень адукаванасці, размеркаванне па прафесійных занятках. Вызначаюцца фактары, якія ўплывалі на грамадска-палітычную актыўнасць моладзі. Паказваецца яе роля ў развіцці беларускага нацыянальнага руху, асвятляюцца накірункі дзейнасці вучнёўскай, сялянскай і рабочай моладзі, разглядаюцца ўзаемаадносіны моладзі і партый розных палітычных плыняў.

**Палажэнні, вынесеныя на абарону**

1. Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы, якія адбываліся ў канцы XIX ст. – жніўні 1914 г. у Расійскай імперыі, аказвалі значны ўплыў на моладзь, у значнай ступені абумоўліваючы і яе структуру, і яе дзейнасць. На тэрыторыі пяці беларускіх губерняў у 1897 г. моладзь ва ўзросце 16-29 гадоў складала 36,5% ад усіх жыхароў беларускіх губерняў – 2 150 351 чалавек. У асноўным беларуская моладзь была малаадукаванай (36% ад усёй моладзі – 779576 чалавек), праваслаўнай (60% – 862806 чалавек ва ўзросце 20-29 гадоў), беларускамоўнай (840693 чалавекі – 59% ад усёй моладзі ва ўзросце 20-29 гадоў) і адносілася да асоб сельскага стану (1 084 558 чалавек – 76% ад колькасці моладзі ва ўзросце 20-29 гадоў). Па прычыне адсутнасці ў Расійскай імперыі спецыяльна распрацаванай заканадаўча аформленай маладзёжнай палітыкі ў беларускіх губернях за маральнае і грамадзянскае выхаванне моладзі адказвалі: сям’я, царква, навучальныя ўстановы.

2. Мадэрнізацыйныя працэсы, якія адбываліся ў беларускіх губернях, спрыялі актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці вучнёўскай моладзі. З-за адсутнасці на тэрыторыі беларускіх губерняў вышэйшых навучальных устаноў дзейнасць моладзі канцэнтравалася ў межах гімназій, прагімназій, вучылішч, семінарый, настаўніцкіх інстытутаў. Станаўленне і разгортванне вучнёўскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў адбывалася ў канцы XIX ст. – снежні 1904 г., што праявілася ва ўзнікненні розных па памеры вучнёўскіх гурткоў. Аднак найбольшага росквіту актыўнасць вучнёўскай моладзі дасягнула падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., што звязана з агульным развіццём грамадска-палітычнага жыцця Расійскай імперыі, значнай агітацыйна-прапагандысцкай працай палітычных партый. Сярод праяў удзелу моладзі ў жыцці беларускіх губерняў можна адзначыць: удзел у маніфестацыях, выступленнях, забастоўках, агітацыйна-прапагандысцкую дзейнасць. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 г. адбываецца агульнае значнае скарачэнне грамадска-палітычнай актыўнасці моладзі і на першы план яе дзейнасці выходзіць культурна-асветніцкая праца.

3. Дасягненні і складанасці сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі беларускай вёскі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. прыводзілі да росту актыўнасці сялянскай моладзі. Пры гэтым яе выступленні не былі адасобленымі, а з’яўляліся часткай усяго сялянскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў у разглядаемы час. Пераважная большасць выступленняў сялянскай моладзі адбывалася стыхійна і мела эканамічны, а не палітычны характар. Найбольшага росквіту яе дзейнасць дасягнула падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., што ў пэўнай ступені было звязана з агітацыйна-прапагандысцкай працай сярод сялянства з боку рэвалюцыйна-дэмакратычных партый. Пасля Першай расійскай рэвалюцыі грамадска-палітычная дзейнасць сялянскай моладзі амаль спыняецца. Не прывяла да актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці і сталыпінская аграрная рэформа. Разам з тым, у гэты час моладзь канчаткова выйшла ў авангард усяго сялянскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў, у значнай ступені вызначаючы яго формы і метады дзейнасці.

Развіццё капіталістычных адносін садзейнічала росту колькасці рабочага класа на тэрыторыі беларускіх губерняў. Сярод працоўных найбольшай грамадска-палітычнай актыўнасцю адрозніваліся прадстаўнікі моладзі. Выступленні працоўнай моладзі былі часткай усяго рабочага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў. Найбольшага размаху выступленні рабочай моладзі дасягнулі падчас Першай расійскай рэвалюцыі. Яна прымала актыўны ўдзел у дэманстрацыях, мітынгах, забастоўках, адначасова спалучаючы сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя патрабаванні. Значную ролю ў актывізацыі дзейнасці рабочых адыгрывалі палітычныя партыі, перш за ўсе рэвалюцыйна-дэмакратычныя – БУНД, РСДРП, ПС-Р, БСГ і інш. Пасля

рэвалюцыі 1905–1907 гг. адбываецца значнае скарачэнне грамадска-палітычнай актыўнасці рабочай моладзі. Нягледзячы на некаторы ўздым маладзёжнага рабочага руху ў 1911 і 1913 гг., дасягнуць узроўню Першай расійскай рэвалюцыі ён не змог.

4. Выступаючы за карэннае змяненне грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу краіны, партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні мелі найбольшы ўплыў сярод моладзі беларускіх губерняў. Пры гэтым, звычайна, менавіта моладзь стаяла ля вытокаў гэтых партый і складала іх асноўны сацыяльны падмурак. Найбольш актыўна яна ўзаемадзейнічала з такімі партыямі, як БУНД і ПС-Р, што было звязана са значнай рэвалюцыйнай актыўнасцю яўрэйскай моладзі і дамінаваннем сельскай гаспадаркі ў эканоміцы беларускіх губерняў. Партыя РСДРП карысталася меншай папулярнасцю з-за адноснай нешматлікасці рабочага класа і другаснасці сельскага пытання ў праграмных патрабаваннях партыі. БСГ не набыла вялікай распаўсюджанасці сярод моладзі беларускіх губерняў, аднак яе існаванне і актыўная дзейнасць значна паспрыялі нацыянальнаму абуджэнню беларускага народа, што ў сваю чаргу сведчыла аб тых глыбокіх мадэрнізацыйных зменах, якія адбываліся ў краіне. Найбольшага росквіту дзейнасць моладзі рэвалюцыйна-дэмакратычных партый дасягнула падчас Першай расійскай рэвалюцыі. Прадстаўнікі моладзі ўдзельнічалі ў мітынгах і маніфестацыях, сходах, забастоўках, займаліся агітацыйна-прапагандысцкай працай, ладзілі чытанні палітычных рэфератаў, ажыццяўлялі тэрарыстычныя акты і інш. Аднак пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. большасць мясцовых арганізацый партый прыпынілі сваю дзейнасць, што звязана з усталяваннем трэццячэрвенскай палітычнай сістэмы, арыштамі і высылкай актыўных членаў партый, агульным спадам грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва беларускіх губерняў. Новы ўздым актыўнасці моладзі рэвалюцыйна-дэмакратычных партый наглядаўся толькі бліжэй да Першай сусветнай вайны.

5. Моладзь беларускіх губерняў слаба падтрымлівала партыі і арганізацыі ліберальнай і кансерватыўнай арыентацый. Гэта было вынікам адносна невысокага распаўсюджвання ліберальных і кансерватыўных ідэй сярод насельніцтва беларускіх губерняў. Моладзі беларускіх губерняў, як і ў цэлым у Расійскай імперыі, было недастаткова ў ліберальных партыях радыкальнасці патрабаванняў па змяненні грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу краіны, актыўнасці ў палітычнай дзейнасці. Не падзяляла яна і кансерватыўныя ідэі аб нязменнасці палітычнай сістэмы і сацыяльна-эканамічнага ладу Расійскай імперыі, абмежаванасці ў правах розных катэгорый насельніцтва. Параўнальна актыўна развіваліся ўзаемадачыненні моладзі і ліберальных і кансерватыўных партый толькі падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. У гэты час галоўная сфера ўзаемадзеяння ліберальных і

кансерватыўных партый і моладзі была выключна ў галіне дабрачыннасці, культурна-асветніцкай працы (адкрыццё бібліятэк, школ, чытанне лекцый і інш.). Пасля рэвалюцыі большасць мясцовых аддзелаў ліберальных партый прыпыніла сваё існаванне, што амаль цалкам спыніла іх ўзаемадачыненні з моладдзю. У адрозненні ад агульнарасійскага павелічэння актыўнасці кансерватыўных партый пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг., узаемаадносіны з моладдзю беларускіх губерняў не актывізаваліся, а нават мелі тэндэнцыю да зніжэння.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з’яўляецца самастойным аўтарскім даследаваннем, падрыхтаваным на падставе вывучэння і аналізу шырокага кола крыніц з архівасховішчаў Беларусі, Расіі, Літвы, а таксама навуковай літаратуры па дадзенай праблеме.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб укараненні яе вынікаў**

Вынікі дысертацыйнай работы былі агучаны на 8 навуковых канферэнцыях: міжнародны маладзёжны навуковы форум “Ломоносов-2013” (Масква, 2013); міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў “VII Машеровские чтения” (Віцебск, 2013); “III Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі” (Каўнас, 2013); міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя “Европа: актуальные проблемы этнокультуры” (Мінск, 2013); міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў “IX Машеровские чтения” (Віцебск, 2015); “V Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі” (Каўнас, 2015); “XIII Архіўныя чытанні” (Мінск, 2015); міжнародная навуковая канферэнцыя “Раманаўскія чытанні – XI” (Магілёў, 2015).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыі апублікаваны ў 11 навуковых работах, у тым ліку 5 артыкулах у навуковых выданнях у адпаведнасці з п.18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных спупеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь (агульным аб’ёмам 2,3 аўтарскага аркуша), 1 артыкуле у зборніку навуковых артыкулаў, 5 артыкулах у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура дысертацыі абумоўлена мэтай і задачамі даследавання. Дысертацыйная работа складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае 4 главы, заключэння, бібліяграфічнага спісу і 4 дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі складае 182 старонкі, у тым ліку 4 дадаткі займаюць 19 старонак. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 420 найменняў, у тым ліку асабістыя публікацыі саіскальніка вучонай ступені.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Глава 1 "Гістарыяграфія праблемы. Крыніцы. Метады і метадалогія"** складаецца з трох раздзелаў.

*У раздзеле 1.1 "Гістарыяграфія праблемы"* вызначана ступень распрацаванасці вывучаемай тэмы. Гістарыяграфічны аналіз праведзены па структурна-храналагічным прынцыпе.

Даследаванне розных накірункаў грамадска-палітычнай дзейнасці *вучнёўскай моладзі* пачало актыўна развівацца ў дарэвалюцыйны перыяд. У канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. большасць прац была прысвечана грамадска-палітычнай барацьбе студэнцкай моладзі Расійскай імперыі або дзейнасці вучнёўскай моладзі ў тых гарадах і рэгіёнах краіны, дзе палітычная актыўнасць грамадства была найбольш значнай (С.П. Мельгуноў[1], Б.Р. Фромет[2], Р. Выдрын[3] і інш.). Пасля ўсталявання савецкай улады даследаванне навучэнскай моладзі працягвалася, надаючы асноўную ўвагу гісторыі студэнцтва, удзелу вучнёўскай моладзі ў рэвалюцыйным руху. Карысныя звесткі маюцца ў працах А. Цвікевіча[4], Ф.Ф. Турука[5], А. Станкевіча[6].

Пачынаючы з канца 20-х гг. ХХ ст. даследаванні грамадска-палітычнага руху вучнёўскай моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы ХІХ ст. – жніўні 1914 г. былі падпарадкаваны вывучэнню рэвалюцыйнага, першасна сацыял-дэмакратычнага, руху. Пры гэтым у 70 – 80-я гг. ХХ ст. у СССР маладзёжная праблематыка паступова набывала цэнтралізаваны характар і пачынала вывучацца ў агульнарасійскім маштабе[7].

У 90-х – 2000-х гг. беларускія даследчыкі значна пашырылі вывучэнне грамадска-палітычнай актыўнасці вучнёўскай моладзі. У працы У. Ляхоўскага[8] на падставе крыніц і даследаванняў разглядаецца дзейнасць амаль усіх вядомых

---

[1]Мельгунов, С. П. Из истории студенческих обществ в русских университетах / С. П. Мельгунов. – Москва, 1904. – 71 с.

[2]Фромметт, Б. Р. Очерки по истории студенчества в России / Б. Р. Фромметт. – Москва: Изд-во Т-ва Вольф М. О., 1912. – 134 с.

[3]Выдрин, Р. Основные моменты студенческого движения в России / Р. Выдрин. – Москва : Студенческий голос, 1908. – 86 с.

[4]Цьвікевіч, А. Западно-руссизм. Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў ХІХ і пачатку ХХ стст. / А. Цьвікевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

[5]Турук, Ф. Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Ф. Турук. – Москва : Госуд. изд-во, 1921. – 75 с.

[6]Станкевіч, А. Выбранае / А. Станкевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 360 с.

[7]Гусятников, П. С. Революционное студенческое движение в России. 1899 – 1907 / П. С. Гусятников. – Москва : Мысль, 1971. – 264 с.; Георгиева, Н. Г. Революционное движение в России в конце ХІХ – начале ХХ в. / Н. Г. Георгиева. – Москва : Высшая школа, 1986. – 192 с.; Олесич, Н. Я. В. И. Ленин и революционное студенчество в России / Н. Я. Олесич – Москва : Политиздат, 1982. – 254 с.

[8]Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове ХІХ – І-й палове ХХ ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2012. – 483.

беларускіх маладзёжных арганізацый, многія з якіх былі створаны ў тых ці іншых навучальных установах.

Спецыяльных прац, прысвечаных *грамадска-палітычнай дзейнасці сялянскай і рабочай моладзі* на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г., практычна няма. Звычайна даследчыкамі дзейнасць сялянскай і рабочай моладзі не выдзялялася асобна і разглядалася ў кантэксце ўсяго сялянскага і рабочага руху і праз прызму класавага падыходу (Е.А. Марахавец[9], М.В. Біч[10], Э.М. Савіцкі[11] і інш.). У постсавецкі час сярод даследчыкаў, якія прама ці ўскосна закранаюць грамадска-палітычную дзейнасць сялянскай і рабочай моладзі, неабходна назваць А.Г. Каханоўскага[12], У.Л. Насевіча[13], С.М. Токця[14] і інш.

Гаворачы пра ўзаемадносіны *моладзі і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый*, адзначым, што ў савецкія часы навукоўцы перш за ўсё разглядалі адносіны моладзі і РСДРП, магчымасці для глыбокага і аб’ектыўнага вывучэння іншых партый гэтай плыні былі значна абмежаваны (С. Агурскі, М.В. Біч, Т.Е. Саладкоў[15] і інш.).

З 80-х гадоў XX ст., калі паступова паслабляецца ідэалагічны кантроль, гісторыкі пачынаюць звяртаць больш увагі і на іншыя рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі, сярод якіх ПС-Р, БСГ, БУНД, анархісцкія гурткі і інш.: П.І. Брыгадзін[16], Э.Р. Іофе[17], А.Д. Тогулева [18] і інш.

Доўгі час глыбокае і аб’ектыўнае даследаванне партый *ліберальнай і кансерватыўнай арыентацый* не толькі на тэрыторыі беларускіх губерняў, а і ўсёй Расійскай імперыі амаль не вялося. Гэтыя партыі разглядаліся выключна адмоўна. Змены пачаліся ў канцы 80-х гадоў XX ст., калі цікавасць да

---

[9]Мороховец, Е. А. Крестьянское движение и социал-демократия в эпоху первой русской революции / Е. А. Мороховец – Москва : Ленинград : Гос. изд., 1926. – 240 с.

[10]Бич, М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг. / М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1983. – 280 с.

[11]Савицкий, Э. М. Рабочее движение в Беларуси (июнь 1907 – февраль 1917 гг.) / Э. М. Савицкий. – Минск : БелНИЦДААД, 1995. – 295 с.

[12]Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.

[13]Носевич, В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Минск : Тэхналогія, 2004. – 350 с.

[14]Токць, С. М. Беларуская веска ў эпоху зьменаў / С. М. Токць. – Мінск : Тэхналогія, 2007. – 306 с.

[15]Агурский, С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Агурский. – Минск : Белорус. гос. изд-во, 1928. – 346 с.; Бич, М. О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883-1903 гг. / М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1973. – 232 с.; Солодков, Т. Е. Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907–1914 гг.) / Т. Е. Солодков. – Минск : Наука и техника, 1967. – 371 с.

[16]Бригадин, П. И. Эсеры в Беларуси / П. И. Бригадин. – Минск : Згода, 1994. – 153 с.

[17]Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси / Э. Г. Иоффе. – Минск : АРТИ-ФЕКС, 1996. – 292 с.

[18]Тогулева, А. Д. Беларуская сацыялістычная грамада: праблемы ўтварэння і палітычнай дзейнасці: дыс. …канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. Д. Тогулева. – Мінск, 1996. – 118 л.

кансерватыўных і ліберальных партый пачала ўзрастаць. Матэрыялы аб узаемаадносінах моладзі беларускіх губерняў і ліберальных партый можна знайсці ў даследаваннях У.У. Леановіча[19], Д.С. Лаўрыновіча[20], У.У. Шэлахаева[21] і інш. Так, даследаванні Д.С. Лаўрыновіча багатыя факталагічным матэрыялам і аналізам мноства крыніц, раскрываюць самыя розныя накірункі дзейнасці ліберальных партый і арганізацый на тэрыторыі беларускіх губерняў. Аднак асобна ў яго працах удзел моладзі ў ліберальных партыях не разглядаецца.

Узаемаадносіны моладзі беларускіх губерняў і кансерватыўных партый знайшло сваё адлюстраванне ў працах К.М. Бандарэнкі[22], В.А. Міхедзькі[23], І.В. Амельянчука[24] і інш. У сваіх даследаваннях К.М. Бандарэнка на падставе шматлікіх крыніц вывучае самыя розныя бакі існавання кансерватыўных партый і арганізацый, прыводзячы канкрэтныя звесткі аб удзеле моладзі ў кансерватыўна-манархічных партыях.

На падставе разгледжанай гістарыяграфіі можна зрабіць выснову аб слабым даследаванні пытання, звязанага з удзелам моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў. У існуючых даследаваннях найбольшую колькасць даных можна знайсці аб вучнёўскай моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў, разам з тым па-за ўвагай даследчыкаў застаюцца пытанні ўзаемаадносін моладзі і партый у канцы XIX – пачатку XX ст., не цалкам вывучана і пытанне аб моладзі як асобнай сацыяльнай групе.

*У раздзеле 1.2 “Крыніцы”* аналізуюцца апублікаваныя і неапублікаваныя матэрыялы. Адзначаецца, што аснову даследавання складаюць дакументы, выяўленыя ў межах 20 фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), НГАБ у г. Гродна, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Дяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДАРФ), Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (ЛДГА). У залежнасці ад свайго паходжання і характару інфармацыі крыніцы былі падзелены на групы.

Першая група крыніц – *заканадаўчыя дакументы*. Сярод гэтых дакументаў трэба адзначыць нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентуюць розныя бакі існавання і дзейнасці моладзі, у тым ліку і магчымасці для

---

[19] Леонович, В. В. История либерализма в России. 1763–1914 гг. / В. В. Леонович. – Москва: Русский путь, 1997. – 273 с.

[20] Лавринович, Д. С. Общероссийские либеральные партии и организации в общественно-политической жизни Беларуси (1905-1918 гг.): дис. … доктора исторических наук: 07.00.02 / Д. С. Лавринович. – Минск, 2012. – 294 л.

[21] Шелохаев, В. В. Идеология и политическая организация российской либеральной буржуазии. 1907–1914 гг. / В. В. Шелохаев. – Москва : Наука, 1991. – 231 с.

[22] Бондаренко, К. М. Правые партии и их организации в Беларуси (1905-1917 гг.): монография / К. М. Бондаренко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2010. – 412 с.: ил.

[23] Михедько, В. А. Крайне правые организации в Беларуси: формирование и деятельность (1903-1914 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. А. Михедько. – Минск: БГУ, 2001. – 123 л.

[24] Омельянчук, И. В. Черносотенное движение в Российской империи (1901-1914 гг.) / И. В. Омельянчук. – Киев : МАУП, 2006. – 740 с.

грамадска-палітычнай дзейнасці. Пры разглядзе вучнёўскай моладзі важнымі з'яўляюцца такія дакументы, як "Найвысока зацверджаны Статут гімназій і прагімназій ведамства Міністэрства Народнай Асветы", "Агульны Статут Імператарскіх Расійскіх ўніверсітэтаў" і інш.

Другая група крыніц – *статыстычныя крыніцы*. Найбольш інфарматыўнай крыніцай для даследавання моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў з'яўляўся Першы ўсерасійскі перапіс насельніцтва 1897 г. Крыніца ўтрымлівае звесткі аб агульнай колькасці моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў, яе пола-узроставым складзе, узроўні адукаванасці, сацыяльным паходжанні, сямейным і прафесійным стане.

Трэцяя група крыніц – *дакументы справаводства дзяржаўных органаў улады і розных партый і арганізацый*. Асабліва трэба адзначыць дакументы справаводства палітычнай паліцыі, якія захоўваюцца ў Ф. 102 "Дэпартамента паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў" ДАРФ. Многія дакументы знаходзяцца ў фондах Мінскага ГЖУ – Ф. 705 НГАБ, Мінскага вышуковага гарадскога паліцэйскага ўпраўлення – Ф. 706 НГАБ і інш. Гэта разнастайныя дакументы, такія як цыркуляры, інфармацыйныя данясенні, агентурныя зводкі, агляды палітычных партый, перапіска аб высылцы недабранадзейных грамадзян, дзённікі нагляду за дзеячамі рэвалюцыйных партый і інш.

Вельмі істотныя дадзеныя пра грамадска-палітычную дзейнасць вучнёўскай моладзі ўтрымліваюцца і ў дакументах справаводства Віленскай навучальнай акругі (ф. 2416 НГАБ у Мінску), устаноў адукацыі на тэрыторыі беларускіх губерняў, напрыклад Мінскай мужчынскай гімназіі (ф. 466 НГАБ у Мінску) інш. Гэтыя дакументы прадстаўлены лістамі, інфармацыйнымі запіскамі, цыркулярамі аб грамадска-палітычным становішчы навучальных устаноў у межах Віленскай навучальнай акругі, аб вучнёўскіх выступленнях.

Важнымі з'яўляюцца і *апавядальныя крыніцы* (чацвёртая група крыніц), сярод якіх найбольшай рэпрэзентатыўнасцю адрозніваюцца ўспаміны, мемуары былых удзельнікаў падзей, прадстаўнікоў улады, паліцыі: успаміны П.П. Заварзіна, А.І. Спірыдовіча, С.Ю. Вітэ і інш. Ва ўспамінах Н. Краўца, які пэўны час з'яўляўся памочнікам начальніка Мінскага ГЖУ у Пінску, утрымліваецца вельмі карысная інфармацыя аб дзейнасці палітычнай паліцыі ў Пінску, агітацыйна-прапагандысцкай працы сярод моладзі з боку палітычных партый і інш. Вельмі рэпрэзентатыўнымі крыніцамі з'яўляюцца ўспаміны дзеячаў палітычных партый: А. Луцкевіча, Б. Савінкава, В. Чарнова, А. Тырковай-Уільямс.

Пятая група крыніц – *дакументы перыядычнага друку*: газеты, часопісы і інш. Сярод гэтых крыніц важныя звесткі маюцца ў газеце "Наша Ніва". Асабліва каштоўная інфармацыя ў газеце ўтрымліваецца пра дзейнасць моладзі ў галіне развіцця беларускага нацыянальнага руху: правядзенне прадстаўнікамі

моладзі лекцый, наладжванне асветніцкіх курсаў, стварэнне беларускіх вучнёўскіх саюзаў і інш.

*У раздзеле 1.3 “Метады і метадалогія”* раскрываецца сутнасць метадалагічных падыходаў, выкарыстаных у працы. Дысертацыя пабудавана на асноўных прынцыпах гістарычнага пазнання і даследавання. У ёй знайшлі прымяненне агульнаналагічныя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, параўнанне, аналогія, абагульненне), спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны, метад гістарычнай рэтраспекцыі), колькасныя і міждысцыплінарныя (семантычны метад абагульнення слоўнікавых дэфініцый, гісторыка-прававы) метады даследавання. У прыватнасці, выкарыстоўванне колькасных метадаў дазволіла на падставе матэрыялаў Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. зрабіць абагульненне і сістэматызацыю статыстычных дадзеных, падаць іх у спарадкаванай форме, у выглядзе табліц, прыдатных для далейшага вывучэння і аналізу. З дапамогай семантычнага метаду абагульнення слоўнікавых дэфініцый дысертантам праводзіўся разгляд розных тлумачэнняў паняцця “моладзь”, адбіраліся яе асноўныя характарыстыкі, фармулявалася ўласнае, аўтарскае, тлумачэнне моладзі.

**Глава 2 “Вучнёўская моладзь у грамадска-палітычным жыцці Беларусі”** складаецца з трох раздзелаў.

*У раздзеле 2.1 “Станаўленне і разгортванне вучнёўскага руху (канец XIX ст. – снежань 1904 г.)”* разглядаецца становішча вучнёўскага руху ў канцы XIX ст. і яго ўзмацненне бліжэй да Першай расійскай рэвалюцыі. Адзначаецца, што з-за адсутнасці ў гэты час вышэйшых навучальных устаноў рух навучэнцаў развіваўся ў сярэдніх навучальных установах: гімназіях, вучылішчах, семінарыях. Вучнёўскія арганізацыі былі рознымі па памерах, часам не трывалымі, але прымалі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў. Выступленні вучнёўскай моладзі насілі пераважна акадэмічны характар (звязаны з самім працэсам навучання). Значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё беларускіх губерняў аказвалі рэвалюцыйна накіраваныя студэнты шэрагу ўніверсітэтаў Расійскай імперыі. Вялікае значэнне мела вучнёўская моладзь і ў развіцці беларускага нацыянальнага руху, што праявілася ў стварэнні першай беларускай нацыянальнай партыі – БСГ.

*У раздзеле 2.2 “Удзел вучнёўскай моладзі ў рэвалюцыі 1905–1907 гг.”* зроблен вынік аб тым, што ў гэты перыяд вучнёўская моладзь была адной з самых грамадска-палітычна актыўных частак насельніцтва беларускіх губерняў, якая спалучала і акадэмічныя і палітычныя (знішчэнне самадзяржаўя, раўнапраўе для розных катэгорый насельніцтва і інш.) патрабаванні. Але маладзёжны рух беларускіх губерняў заставаўся пераважна адасобленым і раскіданым па розных навучальных установах. Адсутнічала адзіная

распрацаваная праграма дзейнасці. Мясцовыя ўлады ажыццяўлялі розныя мерапрыемствы па зніжэнні грамадска-палітычнай актыўнасці навучэнцкай моладзі. Сярод іх: узмацненне кантролю за навучэнцамі, пашырэнне ролі педагагічнага савета, адлічэнне з устаноў адукацыі, забарона паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы і інш.

*У раздзеле 2.3 "Рух навучэнцаў у паслярэвалюцыйны перыяд"* аналізуюцца накірункі дзейнасці вучнёўскай моладзі ў перыяд з 1907 г. па жнівень 1914 г. Паказваецца, што дадзены перыяд характарызаваўся скарачэннем дзейнасці навучэнцаў. Пры гэтым галоўную ролю ў вучнёўскім руху ў адзначаны час мелі акадэмічныя патрабаванні і культурна-асветніцкая дзейнасць: актыўна займаліся навучэнцы даследаваннем роднага краю, яго культуры, гісторыі, праводзілі лекцыі, ладзілі чытанні рэфератаў для розных катэгорый насельніцтва ў гарадах, мястэчках і вёсках на тэрыторыі беларускіх губерняў. Плённая праца навучэнцаў асабліва праявілася ў актыўнай дзейнасці маладзёжных гурткоў і арганізацый.

**Глава 3 "Сялянская і рабочая моладзь на тэрыторыі Беларусі"** складаецца з дзвух раздзелаў.

*У раздзеле 3.1 "Сялянская моладзь у грамадска-палітычным жыцці"* даследуюцца перадумовы ўзнікнення і напрамкі актыўнасці руху сялянскай моладзі. На дзейнасць моладзі непасрэдны ўплыў мела развіццё капіталістычных адносін, дэмаграфічны рост, аграрная перанаселенасць вёскі, што сведчыла аб тых глыбокіх мадэрнізацыйных працэсах, якія адбываліся ў краіне ў той час. Найбольшага развіцця грамадска-палітычная актыўнасць сялянскай моладзі беларускіх губерняў дасягнула падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., на што ўплываў агульны ўздым рэвалюцыйнага руху ў краіне, агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць рэвалюцыйных партый, вучнёўскай і працоўнай моладзі. Выступленні сялян вызначаліся стыхійнасцю, адсутнасцю распрацаванай праграмы дзейнасці і патрабаванняў, дамінаваннем сацыяльна-эканамічных патрабаванняў. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. назіраецца значнае скарачэнне грамадска-палітычных выступленняў сялянскай моладзі, як і ў цэлым сялянскага руху.

*У раздзеле 3.2 "Удзел моладзі ў рабочым руху"* паказана, што дзейнасць працоўнай моладзі з'яўлялася неад'емнай часткай усяго рабочага руху на тэрыторыі Беларусі. На яго актывізацыю значны ўплыў аказвала развіццё капіталістычных адносін, дэмаграфічны рост і аграрная перанаселенасць вёскі. Спалучаючы адначасова сацыяльна-эканaнамічныя і грамадска-палітычныя патрабаванні, рух рабочай моладзі прайшоў эвалюцыю ад нешматлікіх і нялькасных гурткоў канца XIX ст. да буйных і ўплывовых аб'яднанняў працоўных падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Пасля Першай расійскай рэвалюцыі наглядаўся значны спад грамадска-палітычнай актыўнасці рабочай моладзі.

Такое становішча, за выключэннем пэўных перыядаў росту і спаду колькасці выступленняў, захоўвалася да жніўня 1914 г.

**Глава 4 "Узаемаадносіны моладзі і палітычных партый на тэрыторыі беларускіх губерняў"** складаецца з двух раздзелаў.

*У раздзеле 4.1 "Накірункі ўзаемадачыненняў моладзі і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый"* падкрэсліваецца, што часта менавіта моладзь стаяла ля вытокаў рэвалюцыйных партый і арганізацый. Пры гэтым як рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі імкнуліся выкарыстоўваць патэнцыял моладзі, так і яна сама актыўна далучалася да гэтых партый падзяляючы іх мэты і задачы, формы і метады барацьбы. Распаўсюджанымі сярод моладзі беларускіх губерняў былі такія партыі як ПС-Р, БУНД, РСДРП, БСГ. Найбольшага развіцця ўзаемаадносіны моладзі і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый дасягнулі падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Пасля Першай расійскай рэвалюцыі наглядалася значнае памяншэнне ўзаемадачыненняў паміж моладззю і рэвалюцыйнымі партыямі.

*У раздзеле 4.2 "Стаўленне ліберальных і кансерватыўна-манархічных партый і арганізацый да палітычнай дзейнасці моладзі"* адзначаецца, што ўзаемаадносіны ліберальных і кансерватыўных партый і арганізацый і моладзі не набылі значнага развіцця на тэрыторыі беларускіх губерняў. Галоўным чынам узаемадносіны моладзі з ліберальнымі і кансерватыўнымі партыямі знаходзіліся ў межах культурна-асветніцкай і выхаваўчай працы. Параўнальна актыўна развіваліся ўзаемадачыненні паміж моладдзю і ліберальнымі партыямі падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. Найбольшай папулярнасцю сярод моладзі карысталася Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя "Народнай Свабоды". Пасля рэвалюцыі стасункі паміж моладдзю і большасцю аддзелаў ліберальных партый і арганізацый значна паменшыліся. Кансерватыўныя партыі сваю ўвагу засяроджвалі на студэнтах вышэйшых навучальных устаноў, што адлюстравалася у дзейнасці ўніверсітэцкіх "акадэмічных" маладзёжных арганізацый. На тэрыторыі беларускіх губерняў значных стасункаў паміж моладдзю і кансерватыўнымі партыямі амаль не наглядалася.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Моладзь на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г. была складанай і дыферэнцыраванай сацыяльна-ўзроставай групай, на якую непасрэдным чынам аказвалі ўплыў сацыяльна-эканамічныя (узнікненне новых сацыяльных груп – рабочых і буржуазіі, развіццё капіталістычных

адносін) і грамадска-палітычныя (стварэнне палітычных партый і рухаў, пашырэнне дэмакратычных патрабаванняў сярод розных колаў насельніцтва) змены, якія адбываліся ў Расійскай імперыі. Усе гэтыя змены не былі выпадковымі, а з’яўляліся заканамерным вынікам глыбокіх мадэрнізацыйных пераўтварэнняў, якія адбываліся ў краіне. Моладзь, звычайна, найбольш актыўная, дынамічная частка грамадства, першай адчувала гэтыя змены і рэагавала на іх у адпаведнасці з тымі каштоўнасцямі, стэрэатыпамі і светаўспрыманнем, якія яна атрымала ад грамадства, у якім адбывалася яе станаўленне.

Згодна з перапісам 1897 г. агульная колькасць моладзі беларускіх губерняў ва ўзросце 16-29 гадоў складала 2 150 351 чалавек (36,5 % ад усіх жыхароў беларускіх губерняў). Беларуская моладзь была малаадукаванай: адукаваных налічвалася 779576 чалавек (36% ад усёй моладзі і 13,2% ад усяго насельніцтва беларускіх губерняў). Прычым, адукаваных маладых мужчын было значна больш, чым жанчын – 496944 чалавекі (23% ад усёй моладзі), жанчын – 282632 чалавекі (13% ад усёй моладзі). Па сваім веравызнанні моладзь у большасці была праваслаўнай – 862806 чалавек (60% ад маладых людзей ва ўзросце 20-29 гадоў). На другім месцы па распаўсюджанасці сярод моладзі быў каталіцызм 315834 чалавекі (22% ад усёй моладзі ва ўзросце 20-29 гадоў). На трэцім іўдзейства – 196660 чалавек (14% ад усёй моладзі). Больш за палову маладых людзей (59% - 840693 чалавекі) ва ўзросце 20-29 гадоў лічылі беларускую мову сваёй роднай. Яўрэйская мова (ідыш) была роднай для 196627 чалавек (13,8% ад усёй моладзі ва ўзросце 20-29 гадоў). Трэцяй па распаўсюджанасці была руская мова, яе лічылі роднай 138215 чалавек (9,7% ад усёй моладзі ва ўзросце 20-29 гадоў). Пры гэтым асноўная колькасць маладых людзей ва ўзросце 20-29 гадоў на тэрыторыі беларускіх губерняў адносілася да асоб сельскага стану (сялян, казакоў, замежных пасяленцаў і т.д.) – 1 084 558 чалавек (76%).

Агульны партрэт моладзі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стст. выглядаў наступным чынам: малаадукаваная, беларускамоўная, праваслаўная і адносілася да сельскай мясцовасці. Пры гэтым, нягледзячы на важную ролю моладзі ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны і яе значную грамадска-палітычную актыўнасць, улады краіны не мелі ў адносінах да яе пэўнай афармленай палітыкі. Адказваць за станаўленне моладзі павінны былі сям’я, царква, навучальныя ўстановы, паліцыя і жандармерыя. [3, 6, 7, 10]

2. Распаўсюджанне і дэмакратызацыя адукацыі ў сукупнасці з агульным ростам рэвалюцыйнай напружанасці ў краіне непасрэдным чынам спрыялі павелічэнню актыўнасці вучнёўскай моладзі, якая не толькі хутка ўспрымала рэвалюцыйныя ідэі, але і звычайна адыгрывала вядучую ролю ў іх пашырэнні сярод насельніцтва беларускіх губерняў.

Закрыццё пасля паўстання 1863 г. апошняй на тэрыторыі беларускіх губерняў вышэйшай навучальнай установы прывяло да таго, што грамадска-палітычная дзейнасць моладзі ажыццяўлялася ў межах гімназій, прагімназій, вучылішч, семінарый, настаўніцкіх інстытутаў. Найбольшай актыўнасцю адрозніваліся навучэнцы з Мінска, Вільні, Гродна, Віцебска, Слуцка, Пінска, Маладзечна.

Вучнёўская моладзь праяўляла грамадска-палітычную актыўнась яшчэ ў канцы ХІХ ст., час ад часу ажыццяўляючы свае выступленні, спалучаючы акадэмічныя і палітычныя патрабаванні. Важную роль у павелічэнні рэвалюцыйнай актыўнасці навучэнцаў адыгрывалі студэнты вышэйшых навучальных устаноў Масквы, Пецярбурга, Кіева, а таксама агітацыйная праца розных палітычных партый. Менавіта ў гэты час улады краіны пачалі бачыць у вучнёўскім руху значную небяспечнасць для грамадска-палітычнага спакою беларускіх губерняў, аб чым сведчыць значнае, у параўнанні з папярэднімі часамі, павелічэнне колькасці лістоў, распараджэнняў, цыркуляраў наконт таго, як трэба змагацца з палітычнай актыўнасцю навучэнцаў.

Аднак росквіту грамадска-палітычная дзейнасць вучняў дасягнула падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. У рэвалюцыйных выступленнях прымала ўдзел каля 30% навучэнцаў беларускіх губерняў. У гэты час моладзь была адным з важнейшых аб’ектаў агітацыйна-прапагандысцкай працы палітычных партый, перш за ўсё рэвалюцыйна-дэмакратычных, сярод якіх асабліва трэба адзначыць ПС-Р, БУНД, БСГ, РСДРП. У час рэвалюцыі розныя па памерах выступленні адбываліся амаль у кожнай значнай навучальнай установе. Па самых прыблізных падліках удзел у рэвалюцыных выступленнях прымалі каля 30% навучэнцаў беларускіх губерняў.

Падчас рэвалюцыі вучнёўская моладзь актыўна ўдзельнічала ў маніфестацыях, выступленнях, забастоўках, агітацыйна-прагандысцкай і выдавецкай дзейнасці. Станоўчую ролю ў развіцці грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў адыгрывалі вучнёўскія аб’яднанні, такія як аб’яднанні навучэнцаў Маладзечанскай, Полацкай, Панявежскай, Свіслацкай настаўніцкіх семінарый. Аднак для дзейнасці вучняў была характэрна стыхійнасць выступленняў, адсутнасць распрацаваных патрабаванняў, адзінасці дзейнасці і нетрываласць саміх вучнёўскіх аб’яднанняў. Разам з тым, прадстаўнікі ўладаў, паліцыі і жандармерыі, кіраўніцтва ўстаноў адукацыі былі вымушаны вельмі пільна сачыць за вучнёўскімі настроямі, імкнучыся не дапусціць значных хваляванняў, час ад часу прыбягаючы да такіх мер, як адлічэнне, а часам і арышты найбольш палітычна-актыўных вучняў, спыненне заняткаў у навучальных установах, забарона паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Пасля Першай расійскай рэвалюцыі актыўнасць навучэнцаў на тэрыторыі беларускіх губерняў значна панізілася, але не знікла цалкам. У паслярэвалюцыйны час дзейнасць вучнёўскай моладзі ў асноўным насіла культурна-асветніцкі характар, а не грамадска-палітычны, што добра праявілася, да прыкладу, у дзейнасці Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Новы значны ўздым грамадска-палітычнай актыўнасці назіраўся толькі напярэдадні Першай сусветнай вайны, што было звязана з пашырэннем адукацыі, а таксама рэзкім абвастрэннем міжнародных адносін. [3, 4, 7, 8, 9]

3. У канцы XIX – пачатку XX стст. назіраўся паступовы рост грамадска-палітычнай актыўнасці сялянскай моладзі. Гэты рост не быў выпадковым. На яго непасрэдным чынам паўплывалі павелічэнне насельніцтва і, як вынік, аграрная перанаселенасць вёскі, міграцыя часткі маладых сялян у гарады і іх пралетарызацыя, адкрыццё новых навучальных устаноў і пашырэнне адукацыі сярод сялянства. Важную ролю мела і актыўная агітацыйна-прапагандысцкая праца рэвалюцыйных партый. Гэта напрамую сведчыла аб мадэрнізацыйных працэсах на тэрыторыі беларускіх губерняў, адыходзе ад традыцыйнага тыпу грамадства: сялянства пачынала звязваць свой дабрабыт не толькі з эканамічным развіццём краіны, эканамічнымі пераўтварэннямі, рэдкімі эпізадычнымі саступкамі з боку ўладаў або памешчыкаў у бок сялянства, але і неабходнасцю правядзення палітычных пераўтварэнняў. Зразумела, адчуванне неабходнасці палітычных рэформ не было вельмі значным для большай часткі сялянства, аднак для найбольш дынамічнай, актыўнай яе часткі – моладзі, гэта было відавочна.

Дзейнасць сялянскай моладзі была часткай усяго сялянскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў, якому былі характэрны дамінаванне эканамічных, а не палітычных патрабаванняў, стыхійнасць і неспланаванасць выступленняў, адсутнасць добра распрацаваных патрабаванняў, а таксама значная залежнасць ад агульнага грамадска-палітычнага становішча ў краіне і прапагандысцкай працы з боку палітычных партый.

Рэвалюцыйны ўздым 1905–1907 гг. садзейнічаў актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці сялянскай моладзі. Так, падчас рэвалюцыі адбылося каля 132 сялянскіх выступленняў, ці 12,2% ад усіх выступленняў, якія мелі грамадска-палітычны характар. У параўнанні з папярэднімі часамі, калі палітычныя выступленні былі толькі адзінкавымі, гэта было значнае павелічэнне. У розных месцах беларускіх губерняў адбываліся хваляванні сялян, падчас якіх сярод патрабаванняў павелічэння зямельных надзелаў, памяншэння падаткаў, абмежавання самавольства памешчыкаў, гучалі таксама заклікі аб неабходнасці змены палітычнага ладу краіны, увядзення ўсеагульнай роўнасці правоў для розных катэгорый насельніцтва. Пры гэтым падчас рэвалюцыі 1905–1907 г. сялянская моладзь паступова стала выходзіць на

першае месца ва ўсім сялянскім руху на тэрыторыі беларускіх губерняў, аказваючы непасрэдны ўплыў на яго патрабаванні і практычную дзейнасць.

Пасля Першай Расійскай рэвалюцыі адбываецца скарачэнне грамадска-палітычнай актыўнасці сялянскай моладзі, на што паўплывалі агульны спад рэвалюцыйных настрояў насельніцтва краіны, пэўныя саступкі ўладаў сялянству, эканамічнае развіццё краіны, а таксама правядзенне аграрнай рэформы. Усё гэта прывяло да таго, што за перыяд з 1908 г. па першую палову 1914 г. значных палітычных выступленняў у статыстыцы сялянскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў не зафіксавана. Разам з тым менавіта ў гэты час моладзь канчаткова замацавала за сабой вядучую ролю ў сялянскім руху беларускіх губерняў.

Мадэрнізацыйныя пераўтварэнні ў эканоміцы беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стст. садзейнічалі развіццю капіталістычных адносін і як вынік станаўленню і росту колькасці рабочага класа. Але цяжкія ўмовы жыцця і працы, прававая неабароненасць рабочых садзейнічалі павелічэнню іх грамадска-палітычнай актыўнасці. Сярод рабочага руху дзейнасць рабочай моладзі мела амаль галоўнае значэнне. Пры гэтым яе выступленні звычайна асобна не выдзяляліся і былі часткай усяго рабочага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў. Рабочая моладзь прымала ўдзел у стварэнні і дзейнасці рабочых аб’яднанняў, праяўляла актыўнасць падчас страйкаў, шэсцяў, мітынгаў і інш.

Нягледзячы на палітычную актыўнасць рабочай моладзі ўжо ў канцы XIX – пачатку XX стст. у выглядзе дзейнасці шматлікіх рабочых гурткоў, менавіта рэвалюцыйны ўздым 1905–1907 гг. садзейнічаў найбольш значнай актывізацыі рэвалюцыйных выступленняў працоўных. Толькі ў рэвалюцыйных падзеях студзеня 1905 г. прымала ўдзел больш за 33 тыс. рабочых. Хваляванні і выступленні рабочых адбываліся амаль у кожным горадзе беларускіх губерняў, чаму ў значнай ступені садзейнічала агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць з боку палітычных партый, асабліва БУНДа, РСДРП, БСГ.

Пасля Перашай расійскай рэвалюцыі дзейнасць рабочай моладзі значна скарацілася, чаму спрыяў спад рэвалюцыйных настрояў у краіне і пэўнае паляпшэнне жыцця працоўных, эканамічнае развіццё краіны. Асаблівы спад наглядаўся ў 1908–1910 гг. У гэты час палітычныя выступленні ахоплівалі толькі 0,6 тыс. працоўных беларускіх губерняў. Але актыўнасць рабочай моладзі цалкам не знікла. Працоўная моладзь выступала за правы іншых працоўных, паляпшэнне ўмоў іх працы, што ў сваю чаргу сведчыла аб дамінаванні эканамічных патрабаванняў над палітычнымі. Такое становішча захоўвалася, нягледзячы на пэўнае абуджэнне рабочага руху ў 1911 і 1913 гг., аж да пачатку Першай сусветнай вайны. [3, 6, 9, 10]

4. Пачаўшы ўзнікаць у канцы XIX – пачатку XX стст., партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні былі адзінымі, якія імкнуліся актыўна ўплываць на моладзь, выкарыстоўваць яе ў сваіх мэтах, бачачы ў ёй тую сілу, з дапамогай якой можна змагацца за дасягненне пастаўленых задач. Найбольшую ўвагу на моладзь звярталі такія партыі як ПС-Р, БУНД, РСДРП, БСГ. Пры гэтым моладзь не толькі прымала ўдзел у дзейнасці рэвалюцыйных партый, а звычайна складала іх асноўны сацыяльны падмурак. У значнай ступені гэта было звязана з тым, што ідэі сацыялістычных партый аб сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай роўнасці, знішчэнні самадзяржаўя і інш. былі зразумелымі і блізкімі для моладзі.

З-за дамінавання сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны найбольш актыўна ўплывала на моладзь Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Па прыблізных падліках моладзь складала да 70% працэнтаў гэтай партыі. Значнай распаўсюджанасцю сярод яўрэйскай моладзі карысталася партыя Бунд у межах якой было створана нават спецыяльнае маладзёжнае аддзяленне, т.зв. “Малады Бунд”. У параўнанні з прамыслова развітымі рэгіёнамі Расійскай імперыі, на тэрыторыі беларускіх губерняў РСДРП не набыла значнай распаўсюджанасці сярод моладзі з-за адносна невялікай колькасці рабочага класа і недастатковай увагі да сельскага пытання. Партыя БСГ, у фарміраванні і дзейнасці якой моладзь адыгрывала галоўную ролю, таксама не здолела дасягнуць значнага ўплыву на моладзь з-за дамінавання эканамічных і палітычных патрабаванняў сярод моладзі над нацыянальнымі, значнай канкурэнцыі за ўплыў на маладых людзей з боку іншых рэвалюцыйных партый. Аднак БСГ адыграла вялікую ролю ў станаўленні і распаўсюджванні беларускай нацыянальнай ідэі як сярод моладзі, так і сярод усяго насельніцтва беларускіх губерняў.

Нягледзячы на актыўнае ўзаемадзеянне моладзі і рэвалюцыйных партый у канцы XIX – пачатку XX стст., тым не менш, найбольш шчыльнымі былі іх узаемаадносіны падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. На тэрыторыі беларускіх губерняў прадстаўнікі моладзі, з’яўляючыся членамі названых палітычных партый, прымалі актыўны ўдзел у мітынгах і маніфестацыях, сходах, забастоўках, займаліся агітацыйна-прапагандысцкай працай, ладзілі чытанні рэфератаў і інш. Пасля рэвалюцыі стасункі паміж партыямі і моладдзю істотна паменшыліся, на што паўлывала агульнае скарачэнне рэвалюцыйных настрояў у краіне, арышты. Новы ўздым узаемаадносін моладзі і палітычных партый наглядаўся бліжэй да 1914 г. [1, 3, 4, 5, 7]

5. Ліберальныя ідэі на тэрыторыі Расійскай імперыі актыўна распаўсюджваліся ўжо ў XIX ст., аднак менавіта рэвалюцыя 1905–1907 гг. паспрыяла стварэнню замест розных па колькасці груп і арганізацый буйных ліберальных палітычных партый. Але сярод насельніцтва беларускіх губерняў, у тым ліку і сярод моладзі, ліберальныя ідэі не набылі значнага

распаўсюджвання. У значнай ступені гэта звязана з тым, што ліберальныя партыі і арганізацыі імкнуліся да паступовага рэфармісцкага шляху развіцця дзяржавы замест хуткіх і радыкальных рэвалюцыйных змен. На тэрыторыі беларускіх губерняў, дзе палітычна актыўная моладзь у асноўным была рэвалюцыйна накіраванай, ліберальныя партыі не здолелі перацягнуць яе на свой бок, ды і не вельмі жадалі гэтага, лічачы, што галоўнае для моладзі вучыцца, засвойваць тыя маральна-эстэтычныя нормы, якія існавалі ў той час у грамадстве. Для гэтых мэт ліберальныя колы грамадства стваралі розныя дабрачынныя арганізацыі, культурна-асветніцкія ўстановы (адкрыццё бібліятэк, школ і інш.), дзе, па іх меркаванні, моладзь магла атрымаць неабходныя ёй веды і ўліцца ў грамадскае жыццё краіны.

Параўнальна актыўна развіваліся адносіны моладзі і ліберальных партый у перыяд Першай расійскай рэвалюцыі. Сярод усіх ліберальных партый у гэты час найбольш распаўсюджанымі ў маладзёжным асяродку былі ідэі канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі "Народная свабода", якая прадстаўляла левы, радыкальны, накірунак ліберальных партый на тэрыторыі Расійскай імперыі. Аднак і гэта партыя не здолела перацягнуць на свой бок значную частку моладзі беларускіх губерняў, ды і не ставіла такой мэты, звяртаючы асноўную ўвагу на студэнцкую моладзь вышэйшых навучальных устаноў Масквы і Санкт-Пецярбурга. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. многія мясцовыя аддзелы ліберальных партый прыпынілі сваю дзейнасць, што паўплывала і на стасункі з моладдзю. Па сутнасці, ажно да пачатку 1914 г. узаемаадносіны моладзі і ліберальных колаў праяўляліся ў асноўным ва ўдзеле моладзі ў дзейнасці нешматлікіх арганізацый, якія былі створаны лібераламі на тэрыторыі беларускіх губерняў і якія займаліся культурна-асветніцкай, а не палітычнай дзейнасцю.

Узнікшыя на хвалі рэвалюцыі 1905–1907 гг. кансерватыўныя партыі імкнуліся абараняць існуючы ў краіне дзяржаўны лад, змагацца з распаўсюджваннем рэвалюцыйных ідэй сярод насельніцтва, а ў адносінах да беларускіх губерняў яшчэ і супрацьстаяць уплыву з боку яўрэйска-іўдзейскіх і польска-каталіцкіх колаў. Аднак такія патрабаванні не знаходзілі водгуку сярод мясцовай моладзі, якая ў асноўным імкнулася да радыкальных рэвалюцыйных змен у палітычным ладзе і эканоміцы дзяржавы. Гэта прывяло да таго, што кансерватыўныя партыі не мелі значнай падтрымкі з боку моладзі беларускіх губерняў, тым больш, што і самі кансерватыўныя арганізацыі лічылі, што моладзь перш за ўсё павінна займацца адукацыяй, а не палітыкай.

У той час як па ініцыятыве кансерватыўных партый і арганізацый ствараліся многія маладзёжныя акадэмічныя арганізацыі, якія звычайна аб'ядноўвалі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Кіева, Масквы, Санкт-Пецярбурга, у беларускіх губернях стварыць падобныя арганізацыі, нягледзячы

на пэўныя спробы, яны так і не здолелі. Апрача таго, у параўнанні з агульнарасійскай тэндэнцыяй росту колькасці і актыўнасці кансерватыўных партый пасля рэвалюцыі 1905–1907 г., узаемаадносіны з моладдзю амаль не змяніліся. [1, 2, 3, 11]

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы і высновы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы курсаў па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, гісторыі беларускага нацыянальнага руху, гісторыі палітычных партый і рухаў, сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XIX – пачатку XX стст., а таксама пры падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, манаграфій і даведачна-інфармацыйных выданняў. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць карысны пры стварэнні навукова-папулярных фільмаў і літаратуры, накіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў навуковых выданнях згодна з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Вярыга, В. А. Палітыка ўладаў Расійскай імперыі адносна сацыялістычных і ліберальных партый (канец XIX – пачатак XX ст.) / В. А. Вярыга // Российские и славянские исследования: науч. сб. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – Вып. 7. – С. 137–140.

2. Вярыга, В. А. Узаемаадносіны паміж палітычнай паліцыяй і кансерватыўна-манархічнымі партыямі на тэрыторыі беларускіх губерняў (канец XIX ст. – жнівень 1914 г.) / В. А. Вярыга // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2013. – Вып. 8. – С. 27–39.

3. Вериго, В. А. Борьба политических партий за молодежь на территории Беларуси (конец XIX – начало XX в.) / В. А. Вериго // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. сб. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.].– Мінск : БДУ, 2014. – Вып. 9. – С. 27–38.

4. Вярыга, В. А. Вучнеўская моладзь у грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стст. / В. А. Вярыга // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 3. – С. 22–25.

5. Вярыга, В. А. Да пытання вывучэння грамадска-палітычнай дзейнасці моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя (на падставе дакументаў архіваў Рэспублікі Беларусь) / В. А. Вярыга // Архивы и делопроизводство. – 2016. – № 1. – С. 51–52.

**Артыкулы ў іншых навуковых выданнях**

6. Вярыга, В. А. Грамадска-палітычная дзейнасць рабочай і сялянскай моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. / В. А. Вярыга // Современная молодежь и общество: сб. науч. ст. – Минск : РИВШ, 2016. – Вып. 4: Молодежь в мире глобализации и межкультурной коммуникации. – С. 42–47.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

7. Вярыга, В. А. Віцебская гімназія ў гісторыі маладзёжнага руху на тэрыторыі Беларускіх губерняў (канец XIX – пачатак XX ст.) / В. А. Вярыга // VII Машеровские чтения. Материалы научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых учёных, Витебск, 24–25 сентября 2013 г. / Вит. гос. ун-т; редкол. : А. П. Солодков (гл. ред.) – Витебск : УО ВГУ им. П.М. Машерова, 2013. – С. 116–117.

8. Вериго, В. А. Общественно-политическое движение учащейся молодежи Виленского учебного округа (конец XIX – начала XX веков) [Электронный ресурс] / В. А. Вериго // Материалы международного молодежного научного форума «Ломоносов-2013», Москва, 9–12 апреля 2013 г. / Отв. ред. А. И. Андреев, А. В. Андриянов, Е. А. Антипов, К. К. Андреев, М. В. Чистякова – Москва : МАКС Пресс, 2013. – 1 электронный опт. диск (DVD-ROM)

9. Вярыга, В. А. Рабочая і вучнёўская моладзь у грамадска-палітычным жыцці Беларусі (канец XIX – пачатак XX стст) / В. А. Вярыга // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: мат. VII межд. науч.-теорет. конф., г. Минск, 21 января 2013 г. – Минск, 2014. – С. 150–151.

10. Вярыга, В. А. Сялянская моладзь на тэрыторыі беларускіх губерняў падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. / В. А. Вярыга // IX Машеровские чтения. Материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых учёных Витебск, 25 сентября 2015 г. / Вит. гос. ун-т; редкол. : И. М. Прищепа (гл. ред.). – Витебск : УО ВГУ им. П. М. Машерова, 2015. – С. 83–85.

11. Вярыга, В. А. Стаўленне ліберальных партый і арганізацый да грамадска-палітычнай дзейнасць моладзі на тэрыторыі беларускіх губерняў у пачатку XX ст. / В. А. Вярыга // Раманаўскія чытанні – XI : зборнік артыкулаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Магілёў, 26-27 лістапада 2015 г. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2016. – С. 106–107.

**РЭЗЮМЭ**

**Вярыга Вадзім Аляксандравіч**

Моладзь у грамадска-палітычным жыцці на тэрыторыі Беларусі
(канец XIX ст. – жнівень 1914 г.)

**Ключавыя словы:** моладзь, навучэнцы, сялянская моладзь, працоўная моладзь, грамадска-палітычнае жыццё, палітычныя партыі, таемныя арганізацыі, рэвалюцыянеры, лібералы, манархісты, палітычная паліцыя, Віленская навучальная акруга, беларускі нацыянальны рух.

**Мэта даследавання**: паказаць месца моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г.

**Метады даследавання.** Пры напісанні дысертацыі ўжываліся агульналагічныя, спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны), колькасныя і міждысцыплінарныя (семантычны метад аналізу слоўнікавых дэфініцый, гісторыка-прававы метад) метады даследавання.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыі раскрываюцца перадумовы і прычыны ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Вызначана колькасць моладзі і яе дыферэнцыяцыя па полаўзроставай, этна-рэлігійнай, моўнай і прафесійнай прыналежнасці. Выяўлены і вывучаны этапы і напрамкі дзейнасці навучэнцаў, працоўнай, сялянскай моладзі. Аналізуюцца ўзаемаадносіны моладзі з палітычнымі партыямі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні артыкулаў, манаграфій і абагульняючых работ па гісторыі беларускай дзяржаўнасці і беларускага нацыянальнага руху, гісторыі палітычных партый і рухаў, сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XIX – пачатку XX стст. Высновы даследавання могуць знайсці прымяненне пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў, лекцыйных курсаў для вышэйшых навучальных устаноў, факультатыўных курсаў для сярэдняй школы. Акрамя таго, матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць карысны пры стварэнні навукова-папулярных фільмаў і літаратуры, накіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі Рэспублікі Беларусь.

**Вобласць выкарыстання**: гісторыя Беларусі, гісторыя беларускай дзяржаўнасці, гісторыя Расійскай імперыі, гісторыя палітычных партый і рухаў, гістарыяграфія, крыніцазнаўства.

# РЕЗЮМЕ

**Вериго Вадим Александрович**

Молодежь в общественно-политической жизни на территории Беларуси (конец XIX в. – август 1914 г.)

**Ключевые слова:** молодежь, учащиеся, крестьянская молодежь, рабочая молодежь, общественно-политическая жизнь, политические партии, тайные организации, революционеры, либералы, монархисты, политическая полиция, Виленский образовательный округ, белорусское национальное движение.

**Цель исследования:** показать место молодежи в общественно-политической жизни белорусских губерний в конце XIX в. – августе 1914 г.

**Методы исследования.** При написании диссертации применялись общелогические, специально-исторические (историко-сравнительный, историко-системный, историко-генетический), количественные и междисциплинарные (семантический метод анализа словарных дефиниций, историко-правовой метод) методы исследования.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертации раскрываются предпосылки и причины участия молодежи в общественно-политической жизни белорусских губерний в конце XIX – начале XX веков. Определено количество молодежи и её дифференциация по половозрастной, этно-религиозной, языковой и профессиональной принадлежности. Выявлены и изучены этапы и направления деятельности учащейся, рабочей и крестьянской молодежи. Анализируются взаимоотношения молодежи с политическими партиями.

**Рекомендации по использованию.** Материалы диссертации могут быть применены при написании статей, монографий и обобщающих работ по истории белорусской государственности и белорусского национального движения, истории политических партий и движений, социально-экономической истории Беларуси конца XIX – начала XX вв. Результаты исследования могут найти применение при подготовке учебных пособий, лекционных курсов для высших учебных заведений, факультативных курсов для средней школы. Кроме того, материалы диссертационного исследования могут быть полезны при создании научно-популярных фильмов и литературы, направленных на патриотическое воспитание молодежи Республики Беларусь.

**Область использования**: история Беларуси, история белорусской государственности, история Российской империи, истории политических партий и движений, историография, источниковедение.

**RESUME**

**Viaryha Vadzim Aliaksandravich**

Youth in social and political life on the territory of Belarus
(the end of XIX century – august 1914)

**Keywords:** youth, students, peasant youth, working youth, social and political life, political parties, clandestine organizations, revolutionaries, liberals, monarchists, political police, Vilna educational district, Belarusian national movement.

**The purpose of the research:** to show the role of youth in the social and political life of the Belarusian provinces in the late XIX century-august 1914.

**The research methods.** Logic, special historical (historical comparative, historical systemic, historical genetic), quantitative and interdisciplinary (semantic method of analysis of dictionary definitions, historical and legal) research methods were used.

**The results obtained and their novelty.** The thesis reveals the prerequisites and reasons for the participation of different categories of youth in the social and political life of the Belarusian provinces in the late XIX – early XX centuries. The number of young people and their differentiation by age, ethno-religious, linguistic and professional features are determined. The stages and activities of studying, working, peasant youth are identified and studied. The relations of youth with political parties are analyzed.

**Recommendations for use.** The dissertation material can be used in writing articles, monographs and generalizing works on the history of the Belarusian statehood and Belarusian national movement, history of political parties and movements, socio-economic history of Belarus in the late XIX – early XX centuries. The results of the study can be applied in the preparation of teaching aids, general lecture and special courses for secondary schools. In addition, the materials of the dissertation research can be useful in developing science-education films and literature aimed to patriotic education of Belarusian youth.

**Area of use**: history of Belarus, history of the Belarusian statehood, history of the Russian Empire, history of political parties and movements, historiography, source study.